# Салдат — заўжды салдат

—Добры дзень, паважаны Аляксей Канстанцінавіч, пішуць Вам піянеры школы № 3 горада Болахава Тульскай вобласці. У гады Вялікай Айчыннай вайны Вы абаранялі наш горад, які быў тады невялікім пасёлкам.

Пра Вас мы даведаліся ад Наздрухіна В. М., былога намесніка начальніка штаба палка 1322,413-ай стралковай дывізіі.

Нам яшчэ многа невядома аб абароне роднага горада, а да 50-годдзя Савецкай улады мы вырашылі закончыць краязнаўчую работу...

Такое пісьмо нядаўна атрымаў Маісейкін Аляксей Канстанцінавіч, старшыня РК ДТСААФ. І ён успомніў кравапралітныя баі пад Болахавым, сваіх сяброўаднапалчан.

Некаторых з іх няма ўжо больш чым дваццаць гадоў, а некаторыя жывуць і працуюць зараз. Куды іх толькі лёс не закінуў. З многімі Аляксей Канстанцінавіч перапісваецца.

Праз 25 гадоў атрымаў Аляксей Канстанцінавіч пісьмо тав. Наздрухіна, які зараз збірае дакументы аб героях вядомай абароны. Гэта ён расказаў піянерам аб шляху сапраўднага чалавека, які знешне мала чым выдзяляецца сярод хацімчан. Праўда, вопытным вокам можна различыць, што чалавек, напэўна, шмат гадоў аддаў ваеннай службе.

Нягледзячы на свой паважылы ўзрост Аляксей Канстанцінавіч строгі, падцягнуты, нават крыху знешне суровы.

Падпалкоўнік запаса Аляксей Канстанцінавіч Маісейкін нарадзіўся ў вёсцы Баханы. Да службы ў Арміі настаўнічаў. У Армію пайшоў добраахвотнікам. Ваяваць пачаў палітруком роты ў 413-ай дывізіі.

Пад Болахавым амаль усіх камандзіраў дывізіі забіла, адказнасць за выйсце з аружэння ўзяў на сябе палітрук Маісейкін. Дывізія не толькі выйшла з акружэння, але сыграла немалую ролю пры разгроме ворага пасля, паблізу Тулы.

Зараз 413-ай стралковай дывізіі ў горадзе Болахаве пастаўлен помнік. Тут Аляксей Канстанцінавіч атрымаў п е р ш у ю баявую ўзнагароду ордэн Чырвонай Зоркі.

Болахаў — Тула — Серпухаў. Пад Серпуханым цяжка параненага Аляксея Канстанцінавіча эвакуіравалі ў Новасібірск. Яшчэ не паспелі зажыць мінулыя раны, як Аляксей Канстанцінавіч дабіваецца выпіскі і вяртаецца ў сваю часць.

Гвардыі маёр Маісейкін Аляксей Канстанцінавіч вызваляў і Хоцімск. З дазволу камандавання ён заехаў у сваю родную вёску Баханы, дзе арганізаваў мітынг. Землякі горача сустрэлі воіна-вызваліцеля. Доўга гутарыў з імі Аляксей Канстанцінавіч. Ён расказваў аб міжнароднай абстаноўцы, аб хуткай перамозе. А колькі баявых эпізодаў, іх не перакажаш; аб іх усіх не напішаш. Штурм Граўдзенца, вызваленне Польшчы. І сярод шматлікіх ордэнаў і медаляў на грудзях Алексея Канстанцінавіча з'явіўся польскі ордэн «На полі брані».

Вайна закончылася, але Аляксей Канстанцінавіч паранейшаму застаецца ў радах Савецкай Арміі, навучае моладзь баявой і палітычнай падрыхтоўцы. На самай справе, Аляксей Канстанцінавіч выконвае тую ж работу ў ДТСААФ, што і яго сябры-афіцэры.

... Я доўга думаў, як назваць свой невялікі артыкул, і прыйшоў да вываду, што лепшай назвы,як «Салдат — заўжды салдат»,якая б так адпавядала характару, паводзінам і жыццю Аляксея Канстанцінавіча Маісейкіна, не знойдзеш.

**В. Анатольеў.**

**Анатольеў, В. Салдат – заўжды салдат** / В. Анатольеў // Калгасная звязда. — 1967.

*Аляксей Канстанцінавіч Маісейкін, ўраджэнец в. Баханы Хоцімскага раёна.*